
## Метадычныя рэкамендацыі

Перад выкананнем электронных заданняў па фанетыцы і фаналогіі трывала засвойце класіфікацыі гукаў: для галосных – класіфікацыі па месцы ўтварэння, ступені падняцця языка, а таксама ўдзелу губ; для зычных – па месцы і спосабе ўтварэння, удзелу голасу і шуму, а таксама наяўнасці або адсутнасці палаталізацыі. Толькі добра засвоіўшы названыя класіфікацыі гукаў, пераходзьце да выканання заданняў.

Пры вызначэнні тыпаў чаргаванняў галосных гукаў можа дапамагчы пастаноўка націску. Памятайце, што пры пазіцыйным чаргаванні галосных націскны гук [э] не пад націскам пераходзіць у [а]: век – вякі, рэкі – рака. Пры гістарычным чаргаванні мена [э] на [а] не залежыць ад націску: ле´зці – ла´зіць.

Звяртайце ўвагу на моцныя і слабыя пазіцыі звонкіх і глухіх, цвёрдых і мяккіх зычных гукаў.

Для таго каб вызначыць фанему, трэба прывесці гук у слабай пазіцыі да моцнай: н[а]га´ -- н[о´]гі, таму гук [а] ў слове *нага* будзе прадстаўлены фанемай <о> . Калі прывесці гук да моцнай пазіцыі немагчыма, то ўзнікае гіперфанема. Так, у слове *шпалеры* нельга прывесці да моцнай пазіцыі гук [а], значыць на яго месцы будзе гіперфанема <$^{а}_{о}$>.

Заданні выконвайце паслядоўна, паколькі яны размешчаны з улікам прынцыпу ўзрастання складанасці.

Выкарыстанне электронных матэрыялаў дазволіць самастойна авалодаць практычнымі навыкамі ў засваенні гэтай тэмы і замацаваць набытыя веды, а таксама паспрыяе высокай ступені аптымізацыі заняткаў, эканоміі вучэбнага часу, эфектыўнасці засваення матэрыялу.

## Літаратура

1. Беларуская граматыка. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск. Мінск, 1985.
2. Беларуская мова: Энцыкл. / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мінск, 1994.
3. Крывіцкі А.А., Падлужны А.І. Фанетыка беларускай мовы. Мінск, 1984.
4. Лепешаў І.Я. і інш. Практыкум па беларускай мове: Вучэб. дапам. Мінск, 2001.
5. Падлужны А.І. Нарыс акустычнай фанетыкі беларускай мовы. Мінск, 1997.
6. Падлужны А.І. Фаналагічная сістэма беларускай літаратурнай мовы. Мінск, 1969.
7. Падлужны А.І., Чэкман В.М. Гукі беларускай мовы. Мінск, 1973.

8. Плотнікаў Б.А., Антанюк Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум. Мінск, 2003.
9. Сучасная беларуская мова: вучэб. дапам. / Пад агул. рэд. Л.М. Грыгор’евай. Мінск, 2006.
10. Сучасная беларуская мова: Уводзіны. Фанетыка. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Фразеалогія. Фразеаграфія: Вучэб. дапам. 2-е выд. Мінск, 1995.
11. Сямешка Л.І. і інш. Курс беларускай мовы: Падручнік. Мінск, 1996.
12. Фанетыка беларускай літаратурнай мовы. Мінск, 1989.
13. Фанетыка слова ў беларускай мове. Мінск, 1983.
14. Шкраба І.Р. Варыянтнасць у сучаснай беларускай мове. Мінск, 2004.

## Кантрольны тэст

1. Адзначце рад, у якім ёсць толькі галосныя пярэдняга рада.
1) [э], [о], [ы];
2) [і], [ы], [у];
3) [у], [а], [э];
4) *[і], [э];
5) [і], [а], [о].

2. Адзначце рад, у якім ёсць толькі галосныя верхняга пад’ёму.
1) [а], [і], [о];
2) [у], [о];
3) [э], [о];
4) [ы], [а];
5) *[і], [ы], [у].

3. Адзначце рады, у якіх ёсць толькі санорныя зычныя гукі.
1) [в], [б], [j], [ф], [γ];
2) *[л’], [м], [н’], [в’], [j];
3) *[ў], [в], [м], [л], [р];
4) [р], [т], [з], [ц], [к];
5) [ф], [ч], [п], [л], [ў].

4. Адзначце рады, у якіх ёсць толькі зубныя гукі.
1) *[д], [с], [ц], [z], [л’];
2) [ф], [н], [z’], [ч], [с];
3) [z’], [ш], [ж], [н’], [ž];
4) *[р], [н], [т], [з], [л];
5) [ў], [м], [н], [ц], [д].

5. Адзначце рады, у якіх ёсць толькі выбухныя гукі.

1) *[б’], [п], [д], [к], [г];
2) [п], [ў], [з], [ж], [м];
3) *[б], [п’], [т], [к’], [г’];
4) [т], [р], [с], [ц], [б];
5) [д], [к], [л], [ф], [j].

6. Адзначце рад, у якім ёсць толькі афрыкаты.
1) *[ʒ], [ц], [ǯ], [ч], [ц’];
2) [ч], [ж], [с’], [ш], [ў];
3) [ǯ], [ʒ], [j], [г], [γ];
4) [ʒ’], [п], [з’], [ж], [ш];
5) [ў], [к], [р], [т], [ф].

7. Выберыце правільнае сцвярджэнне. Метад кантрастнай дыстрыбуцыі заключаецца ў:
1) *проціпастаўленні ў аднолькавых фанетычных умовах пар слоў, якія адрозніваюцца толькі адным гукам;
2) проціпастаўленні ў розных фанетычных умовах пар слоў, якія адрозніваюцца толькі адным гукам;
3) проціпастаўленні ў аднолькавых фанетычных умовах пар слоў, якія адрозніваюцца некалькімі гукамі;
4) проціпастаўленні ў аднолькавых фанетычных умовах пар слоў, якія не адрозніваюцца.

8. Адзначце, якія галосныя фанемы вылучаюцца ў падсістэме агульнаўжывальных слоў.
1) *<а>;
2) *<э>;
3) *<о>;
4) <ы>;
5) *<у>;
6) *<і>.

9. Адзначце алафоны фанемы <з>.
1) *[с];
2) *[з$^{о}$];
3) [ц];
4) *[ж];
5) [ʒ];
6) [ʒ’];
7) *[з];
8) [ц’];
9) *[с’];
10) *[ш].

10. Адзначце гукі ў перцэптыўна слабай пазіцыі.
1) *[х] (у слове *хрызантэма*);
2) *[р];
3) *[ы];
4) [з];
5) [а];
6) *[н];
7) *[т];
8) *[э];
9) [м];
10) [а].

11. Адзначце гукі ў сігніфікатыўна моцнай пазіцыі.
1) [а] (у слове *артыстычны*);
2) [р];
3) *[т];
4) [ы];
5) [с];
6) *[т];
7) *[ы];
8) *[ч];
9) *[н];
10) [ы].

12. Адзначце гукі ў абсалютна моцнай пазіцыі.
1) *[п] (у слове *па-простаму*);
2) [а];
3) [п];
4) [р];
5) *[о];
6) [с];
7) *[т];
8) [а];
9) [м];
10) [у].

## Раздзел 2.
## СКЛАД. СКЛАДАПАДЗЕЛ. НАЦІСК

### Анатацыя

У курсе звяртаецца ўвага на будову склада, на асноўныя тэндэнцыі ў мадэлях беларускага склада. Гэта істотна, таму што склад з’яўляецца мінімальнай вымаўленчай адзінкай.

Прасадычная сістэма беларускай мовы (інтанацыя, націск) мае вялікае значэнне ў вусным маўленні чалавека, паколькі яна дазваляе інтанацыйна аформіць выказванне ў адзінае цэлае. Прасодыка – паняцце шматпланавае, якое ўключае інтанацыю і яе кампаненты (тэмбр, паўзы, мелодыку, рытм, тэмп), пастаноўку націску. Інтанацыя дазваляе выказаць дадатковую інфармацыю, выразіць пачуцці і эмоцыі моўцы. Пры дапамозе розных інтанацыйных канструкцый аднаму і таму ж выказванню можна надаць розны сэнс. Веданне пра гэта значна ўзбагаціць і разнастаіць зносіны паміж людзьмі. Правільнае выкарыстанне паўз (колькасць і працягласць), а таксама лагічнага націску дазволіць акцэнтаваць увагу на сэнсава важнай інфармацыі.

Правільная пастаноўка націску спрыяе камунікацыі. Яна дапаможа адрозніць літаратурны варыянт ад прастамоўнага. Націск адрознівае не толькі самастойныя словы, а і граматычныя формы. У блізкіх мовах (беларускай і рускай, беларускай і польскай і г.д.) існуюць словы, аднолькавыя па значэнні, але з розным націскам (крапіва´ – крапи´ва, мы´сленне – мышле´ние…). Правільная пастаноўка націску ў падобных словах гаворыць пра добрае разуменне асаблівасцяў беларускага маўлення, пра веданне спецыфікі ў пастаноўцы націску. У прапанаваным курсе ўвага звяртаецца на асаблівасці вымаўлення самастойных і службовых слоў.

У прапанаваным курсе змешчаны тэарэтычныя і практычныя матэрыялы, якія дазваляюць самастойна пазнаёміцца з матэрыялам, сістэматызаваць яго, паглыбіць веды. Прыводзяцца кантрольныя тэсты, даецца пашыраны спіс літаратуры.

Студэнты павінны **ведаць**:

- тыпы складоў, розныя падыходы да вызначэння прыроды склада;
- асаблівасці складападзелу;
- функцыі інтанацыі;
- функцыі націску;
- віды націску.

Студэнты павінны **ўмець**:

- характарызаваць склады;
- рабіць складападзел;
- адрозніваць фанетычны складападзел ад графічнага і марфемнага падзелу слова;
- правільна расстаўляць націскі ў словах, сінтагме, фразе.

## Метадычныя рэкамендацыі

Выконваючы электронныя заданні па гэтай тэме, неабходна прытрымлівацца наступных парад.

Улічвайце тэндэнцыю ў беларускім складзе да прыкрытага тыпу. Склады непрыкрытага тыпу найчасцей сустракаюцца ў запазычаных словах: э-поха, э-пас. Самым пашыраным тыпам склада ў беларускай мове з’яўляецца “зычны + галосны”. Менавіта таму ў беларускай мове ўзнікаюць прыстаўныя або ўстаўныя гукі.

Вызначаючы межы складападзелу, аналізуйце гукі па ступені гучнасці: галосныя – самыя гучныя гукі, адпавядаюць лічбе 4; санорныя гукі -- лічбе 3; звонкія зычныя – лічбе 2; глухія зычныя – лічбе 1. **Памятайце, што пры складападзеле не ўлічваецца марфемная структура слова.** Складападзел – з’ява фанетычная.

Расстаўляючы правільна націскі ў словах, памятайце, што націск у беларускай мове свабодны і рухомы, гэта значыць можа быць на любым складзе.

Заданні выконвайце паслядоўна, паколькі яны размешчаны з улікам прынцыпу ўзрастання складанасці.

Выкарыстанне электронных матэрыялаў дазволіць самастойна авалодаць практычнымі навыкамі ў засваенні гэтай тэмы і замацаваць набытыя веды, а таксама паспрыяе высокай ступені аптымізацыі заняткаў, эканоміі вучэбнага часу, эфектыўнасці засваення матэрыялу.

## Літаратура


1. Арашонкава Г.У., Лемцюгова В.П. Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы. Мінск, 1987.
2. Беларуская граматыка. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск. Мінск, 1985.
3. Беларуская мова: Энцыкл. / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мінск, 1994.
4. Выгонная Л.Ц. Інтанацыя. Націск.Арфаэпія. Мінск, 1991.
5. Крывіцкі А.А., Падлужны А.І. Фанетыка беларускай мовы. Мінск, 1984.
6. Лепешаў І.Я. і інш. Практыкум па беларускай мове: Вучэб. дапам. Мінск, 2001.
7. Плотнікаў Б.А., Антанюк Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум. Мінск, 2003.
8. Слоўнік беларускай мовы: Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне. Мінск, 1987.
9. Слоўнік беларускай мовы (цяжкасці правапісу, вымаўлення, акцэнтуацыі, словазмянення). Мінск, 2000.
10. Сучасная беларуская мова: вучэб. дапам. / Пад агул. рэд. Л.М. Грыгор’евай. Мінск, 2006.

11. Сучасная беларуская мова: Уводзіны. Фанетыка. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Фразеалогія. Фразеаграфія: Вучэб. дапам. 2-е выд. Мінск, 1995.
12. Сямешка Л.І. і інш. Курс беларускай мовы: Падручнік. Мінск, 1996.
13. Фанетыка беларускай літаратурнай мовы. Мінск, 1989.
14. Фанетыка слова ў беларускай мове. Мінск, 1983.
15. Шкраба І.Р. Варыянтнасць у сучаснай беларускай мове. Мінск, 2004.

## Кантрольны тэст

1. Адзначце правільныя палажэні, якія характарызуюць кожны склад.
   1) *Непачатковыя склады будуюцца па прынцыпе ўзыходнай гучнасці.
   2) Непачатковыя склады будуюцца па прынцыпе зніжэння гучнасці.
   3) Складападзел залежыць ад мускульнага напружання.
   4) *Пры збегу шумнага і санорнага складападзел адбываецца перад шумным.
   5) *Складападзел адбываецца на месцы найбольшага спаду гучнасці.
   6) Пры збегу шумнага і санорнага складападзел адбываецца паміж шумным і санорным.
   7) *Пры збегу санорнага з шумным складападзел адбываецца пасля санорнага.
   8) Пры збегу санорнага з шумным складападзел адбываецца перад санорным.
   9) *Пры збегу шумных або санорных складападзел адбываецца перад шумнымі або санорнымі.
   10) Пры збегу шумных або санорных складападзел адбываецца паміж шумнымі або санорнымі.

Адзначце склады прыкрытага тыпу.

1) *змя
2) *я;
3) а
4) *нёл;
5) э
6) *пас;
7) *я
8) *га
9) *да;
10) ах.

2. Адзначце склады непрыкрытага тыпу.

1) *эх;
2) *а
3) рма
4) ту
5) ра;
6) я
7) шчар;
8) *а
9) га
10) род.

4. Адзначце склады закрытага тыпу.

1) *пад
2) ма
3) *нуць;
4) *фар
5) ба;
6) ма
7) ці;
8) ка
9) ра
10) *вул.

5. Адзначце склады адкрытага тыпу.

1) бацьк
2) *ка;
3) *е
4) *са
5) ул;
6) еў
7) *ро
8) *па;

9) пар
10) *та.

6. Адзначце словы з правільным складападзелам.
1) *я-блык;
2) чар-вяк;
3) *гуль-тай;
4) *го-рла;
5) аба-ра-ніць;
6) ступ-ка;
7) *во-бла-ка;
8) цэ-нтнер;
9) *ра-спле-сці;
10) *па-да-нне.

7. Адзначце фразы, у якіх інтанацыя на апошняй частцы паніжаецца.
1) Суніц колькі!
2) *Госці прыехалі.
3) *Птушкі прыляцелі.
4) Вы пойдзеце ў бібліятэку? Якую залу?
5) *Вы атрыма˝лі грошы?
6) А цяпер куды збіраецеся?
7) *Прыпынак "Чэрвеньскі рынак".
8) *Каляровы часопіс.
9) Мора кветак!
10) *Вы былі˝ ўчора?

8. Адзначце словы з першым націскным складам.
1) азбест;
2) вуллі;
3) *вусы;
4) каўчук;
5) *ліфты;
6) *спіна;
7) *пурпур;
8) кляцьба;
9) *дзеячы;
10) цяжар.

9. Адзначце словы з другім націскным складам.
1) *апрануты;
2) *далей;
3) прысвіст;
4) *бітум;
5) прысмак;

6) прыяцель;
7) *знахар;
8) пасланец;
9) статут;
10) *дасыта.

10. Адзначце словы з трэцім націскным складам.
1) арахіс;
2) атрыманы;
3) *дазіметр;
4) садавіна;
5) *украінец;
6) *ерэтык;
7) індустрыя;
8) *цыркавы;
9) супавы;
10) *дыспансер.

11. Адзначце словы, у якіх ёсць пабочны націск.
1) басаногі;
2) *штохвілінны;
3) крывапівец;
4) *кроваачышчальны;
5) навагодні;
6) *аўтавагон;
7) *рыбакамбінат;
8) даўгакрылы;
9) *восемсот;
10) *лесанарыхтоўка.

## Раздзел 3.
## АРФАЭПІЯ

### Анатацыя

Веданне асаблівасцей беларускай арфаэпіі спрыяе камунікацыі паміж людзьмі і з’яўляецца неад’емным кампанентам вуснага маўлення. У прапанаваным курсе ўвага звяртаецца на асаблівасці беларускага вымаўлення, на яго значнасць у працэсе камунікацыі, а таксама на прычыны адхіленняў ў арфаэпічных нормах.

Раздзел “Арфаэпія” цесна звязаны з папярэднімі раздзеламі “Фанетыка. Фаналогія” і “Склад. Націск. Інтанацыя”, паколькі арыентаваны на вымаўленне гукаў і іх спалучэнняў у розных фанетычных пазіцыях. Не меншую значнасць у вусным маўленні мае інтанацыя, паколькі яна дапамагае выразіць розныя пачуцці, эмоцыі моўцы да прадмета гаворкі. Інтанацыя нясе

і дадатковую інфармацыю, узбагачае тым самым вуснае выказванне. Правільная пастаноўка націску таксама спрыяе лепшаму разуменню паміж людзьмі. Націск можа адрозніваць не толькі самастойныя словы, але і іх граматычныя формы. Акрамя таго, у блізкіх мовах ёсць група падобных слоў, якія маюць розны націск (спі´на – спина´, паслане´ц – посла´нец). Правільная пастаноўка націску ў такіх словах сведчыць пра разуменне асаблівасцей беларускага маўленя.

У прапанаваным курсе змешчаны тэарэтычныя і практычныя матэрыялы, якія дазваляюць самастойна сістэматызаваць і паглыбіць веды. Прыводзяцца кантрольныя тэсты, даецца пашыраны спіс літаратуры.

Студэнты павінны **ведаць**:

- арфаэпічныя нормы сучаснай беларускай мовы;
- прычыны адхіленняў ад іх;
- арфаэпічныя варыянты;
- асаблівасці вымаўлення спрадвечна беларускіх і славянскіх слоў;
- асаблівасці вымаўлення запазычаных слоў.

Студэнты павінны **ўмець**:

- правільна вымаўляць галосныя і зычныя гукі;
- правільна вымаўляць спалучэнні гукаў як у межах адной марфемы, так і на стыку марфем;
- адрозніваць вымаўленне спрадвечна беларускіх, славянскіх і запазычаных слоў;
- аналізаваць адхіленні ад літаратурнага вымаўлення;
- сачыць за сваім вымаўленнем і аналізаваць яго.

## Метадычныя рэкамендацыі

Выконваючы электронныя заданні па арфаэпіі, неабходна прытрымлівацца наступных парад.

Адны і тыя ж літары могуць абазначаць розныя гукі ў залежнасці ад фанетычнага акружэння або ўмоў вымаўлення.

Адна літара можа абазначаць два гукі ў залежнасці ад умоў вымаўлення (напрыклад, ё, е, і і г.д.), а некаторыя спалучэнні гукаў -- адзін гук (Палессе -- Пале[с:’]е, французскі -- францу[с]кі ).

Каб выбраць правільны варыянт вымаўлення гукаў, трэба вызначыць паходжанне слова – славянскае або запазычанае. Вельмі часта вымаўленне слоў гэтых груп адрозніваецца.

Выбіраючы правільны варыянт вымаўлення, прааналізуйце структуру фанетычнага слова, якое можа складацца са службовага слова і самастойнага. Аднаскладовае службовае слова самастойнага націску не мае, гэта значыць, што яно прымыкае да наступнага самастойнага і вымаўляецца разам з ім як адно непадзельнае цэлае (не буду -- [н’а] бу´ду).

Калі ў фанетычным слове сустракаецца збег зычных гукаў, неабходна прааналізаваць яго, успомніць фанетычныя працэсы ў беларускай мове.

Напрыклад, у слове *дождж* звонкі гук не можа знаходзіцца ў канцы слова – адбываецца аглушэнне дож[ч]. Але перад глухім гукам можа стаяць толькі глухі гук до[шч].

Заданні выконвайце паслядоўна, паколькі яны размешчаны з улікам прынцыпу ўзрастання складанасці.

Выкарыстанне электронных матэрыялаў дазволіць самастойна авалодаць практычнымі навыкамі ў засваенні гэтай тэмы і замацаваць набытыя веды, а таксама паспрыяе высокай ступені аптымізацыі заняткаў, эканоміі вучэбнага часу, эфектыўнасці засваення матэрыялу.

## Літаратура


1. Арашонкава Г.У., Лемцюгова В.П. Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы. Мінск, 1987.
2. Беларуская граматыка. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск. Мінск, 1985.
3. Беларуская мова: Энцыкл. / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мінск, 1994.
4. Выгонная Л.Ц. Інтанацыя. Націск.Арфаэпія. Мінск, 1991.
5. Крывіцкі А.А., Падлужны А.І. Фанетыка беларускай мовы. Мінск, 1984.
6. Лепешаў І.Я. і інш. Практыкум па беларускай мове: Вучэб. дапам. Мінск, 2001.
7. Плотнікаў Б.А., Антанюк Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум. Мінск, 2003.
8. Слоўнік беларускай мовы: Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне. Мінск, 1987.
9. Слоўнік беларускай мовы (цяжкасці правапісу, вымаўлення, акцэнтуацыі, словазмянення). Мінск, 2000.
10. Сучасная беларуская мова: вучэб. дапам. / Пад агул. рэд. Л.М. Грыгор’евай. Мінск, 2006.
11. Сучасная беларуская мова: Уводзіны. Фанетыка. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Фразеалогія. Фразеаграфія: Вучэб. дапам. 2-е выд. Мінск, 1995.
12. Сямешка Л.І. і інш. Курс беларускай мовы: Падручнік. Мінск, 1996.
13. Фанетыка беларускай літаратурнай мовы. Мінск, 1989.
14. Фанетыка слова ў беларускай мове. Мінск, 1983.
15. Янкоўскі Ф.М. Беларускае літаратурнае вымаўленне. 4 выд. Мінск, 1976.


## Кантрольны тэст

1. Адзначце правільны варыянт вымаўлення.
   1) *[з’z’эйс’н’іц’];

2) [н’эˬскажа];
3) *[пац’ц’існуц’];
4) *[атмас’ф’эра];
5) [б’эзˬхоладу];
6) [б’эсˬжалобы];
7) *[чаγос’ц’і];
8) [н’аˬзмоγ];
9) [сˬп’эс’н’ай];
10) *[јонˬыˬјана].

2. Адзначце словы, у якіх гукаў больш, чым літар.

1) *пазнаёмцеся;
2) гарадскі;
3) *раз’езд;
4) *паілка;
5) бязладдзе;
6) адкульсьці;
7) галалёд;
8) *б’еш;
9) цётцы;
10) *абаўю.

3. Адзначце словы, у якіх літара ***і*** абазначае гук [і].
1) іскра;
2) *нуль і адзін;
3) аб’інець;
4) сын і дачка;
5) *імпарт;
6) *заікацца;
7) бортінжынер;
8) звышідэйны;
9) *Індыя;
10) *рук і ног.

4. Адзначце словы, у якіх ётавыя галосныя абазначаюць два гукі.
1) *калье;
2) *елка;
3) лес;
4) люстра;
5) *раз’юшаны;
6) спяваць;
7) *шчаўе;
8) *краіна;
9) ліць;
10) зялёны.

5. Адзначце словы, у якіх літары ***дж*** і ***дз*** абазначаюць адзін гук.
1) *дажджы;
2) аджынаць;
3) *джынсы;
4) паджылкі;
5) *дзень;
6) падзеляніць;
7) адзвінець;
8) *джала;
9) аджыць;
10) *дзіця.

6. Адзначце словы з выбухным [г].
1) *гузік;
2) галава;
3) згінацца;
4) *ганак;
5) гора;
6) *гарсэт;
7) *экзамен;
8) град;

9) гара;
10) *вакзал.

7. Адзначце словы, у якіх літара ***с*** абазначае гук [ш].
1) чэшскі;
2) *сшытак;
3) *расшыць;
4) мыешся;
5) з часам;
6) нясвіжскі;
7) *счарсцвелы;
8) *пясчаны;
9) без шапкі;
10) *расчасаць.

8. Адзначце словы з фанетычным падаўжэннем.
1) *суддзя;
2) купацца;
3) гуллівы;
4) *багацце;
5) асіннік;
6) *каменне;
7) аддзячыць;
8) *ралля;
9) конны;
10) *печчу.

9. Адзначце словы, у якіх назіраецца асіміляцыя зычных па мяккасці.
1) *сцежка;
2) скінуць;
3) *дзверы;
4) *смешны;
5) згінаць;
6) схіліцца;
7) *звечарэла;
8) у печцы;
9) *айсберг;
10) адвесіць.

10. Адзначце словы, у якіх усе зычныя мяккія.
1) *мядзведзь;
2) сям’я;
3) *без цябе;
4) булён;
5) *без спёкі;

6) *вельмі;
7) *ешче;
8) адвесіць;
9) ісціна;
10) *іней.

11. Адзначце словы, у якіх назіраецца прыпадабленне шыпячых да свісцячых.

1) *на дарожцы;
2) *носішся;
3) падпісчык;
4) Брэстчына;
5) адчыні;
6) *на талерачцы;
7) шчасце;
8) сцерагчы;
9) *латышскі;
10) *у місачцы.

## ФАНЕТЫЧНЫ АНАЛІЗ

1. Запісаць слова ў фанетычнай транскрыпцыі.

2. Ахарактарызаваць гукі: па месцы і спосабе ўтварэння, удзеле голасу і шуму, наяўнасці / адсутнасці палаталізацыі, а таксама адзначыць агубленасць (для зычных); указаць становішча адносна націску, рад, пад'ём, лабіялізаванасць / нелабіялізаванасць, а таксама ўплыў суседніх мяккіх зычных (для галосных).

## АНАЛІЗ СКЛАДОВАЙ СТРУКТУРЫ СЛОВА

1. Запісаць фанетычнае слова ў транскрыпцыі.

2. Лічбамі абазначыць ступень гучнасці гукаў.

3. Намаляваць хвалю санорнасці слова.

4. У транскрыпцыі вертыкальнымі рыскамі абазначыць складападзелы.

5. Пранумараваць склады і даць іх характарыстыку па першым і апошнім гуках.

## АНАЛІЗ СЛОЎНАГА НАЦІСКУ

1. Вызначыць, ці мае слова самастойны націск. Колькі націскаў у слове і якія яны (асноўныя ці пабочныя)? Калі слова не мае самастойнага націску, то яно будзе з'яўляцца праклітыкам ці энклітыкам?

2. Калі ў слове ёсць розныя граматычныя формы, то вызначыць месца націску ў іх. Рухомы ці нерухомы формаўтваральны націск у гэтага слова? На якія марфемы падае націск?

3. У вытворнага слова вызначыць месца націску ў тым слове, ад якога яно ўтварылася. Рухомы ці нерухомы словаўтваральны націск?

## АНАЛІЗ НАЦІСКУ Ў ТЭКСЦЕ

1. Абазначыць вертыкальнымі рыскамі межы паміж маўленчымі тактамі і фразамі.

2. Расставіць націскі – асноўны ( ́ ) і пабочны ( ` ) слоўныя націскі, тактавы ( ˝ ), фразавы (‴).

## АНАЛІЗ ІНТАНАЦЫЙНАЙ СТРУКТУРЫ ТЭКСТУ

1. Абазначыць межы паміж маўленчымі тактамі і фразамі.

2. Падкрэсліць цэнтры інтанацыйных канструкцый – склады з тактавым і фразавым націскамі.

3. Над гэтымі цэнтрамі напісаць лічбу, што характарызуе дадзеную ІК.

## ЛЕКСІЧНЫ АНАЛІЗ

1. Вызначыць значэнне слова.

2. Наяўнасць (фанетычныя, акцэнтныя, марфалагічныя) / адсутнасць варыянтаў у слова.

3. Адназначнае ці мнагазначнае слова. Акрэсліць значэнні мнагазначнага слова.

4. Тыпы лексічных значэнняў: прамое / пераноснае, матываванае / нематываванае, канкрэтнае / абстрактнае, агульнае / тэрміналагічнае, свабоднае / звязанае.

5. У слоў з пераносным значэннем высветліць від пераносу: метафара, метанімія, сінекдаха.

6. Нейтральнае ці эмацыянальна афарбаванае (ласк., жарт., іран., зневаж., груб) лексічнае значэнне.

7. Функцыянаванне слова: агульнаўжывальнае, абмежаванае ва ўжыванні (спецыяльная лексіка, дыялектная, жаргонная).

8. Актыўнасць / пасіўнасць выкарыстаня слова: актыўнае, пасіўнае (устарэлае, неалагізм).

9. Функцыянальна-стылявая характарыстыка слова: міжстылістычнае, размоўнае, кніжнае (афіц.-справ., паэт., навук., публіц.)

10. Паходжанне слова: спрадвечнабеларускае, запазычанае са славянскіх моў ці з неславянскіх моў.

11. Падабраць сінонімы, антонімы да слова, указаць амонімы, калі ёсць.

## АНАЛІЗ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ

1. Акрэсліць значэнне фразеалагізма.

2. Вызначыць, адназначны ці мнагазначны фразеалагізм.

3. Семантычны тып фразеалагізма: зрашчэнне, адзінства, спалучэнне, выраз.

4. Структурна-граматычны тып фразеалагізма: фразеалагізмы, якія граматычна адпавядаюць сказу, словазлучэнню, спалучэнню слоў. Вызначыць іх мадэлі. Напрыклад, злучнік + назоўнік (як бабёр), назоўнік + дзеяслоў (сэрца разрываецца) і інш.

5. Марфалагічная класіфікацыя фразеалагізмаў: субстантыўныя, дзеяслоўныя, ад’ектыўныя, адвербіяльныя.

6. Варыянты фразеалагізмаў: фанетычныя, акцэнтныя, марфалагічныя, сінтаксічныя, лексічныя.

7. Стылістычная афарбаванасць фразеалагізмаў: стылістычна нейтральныя, кніжныя і размоўныя. Негатыўная ці пазітыўная канатацыя ў фразеалагізма?

8. Паходжанне фразеалагізмаў: агульнаславянскія, агульнаўсходнеславянскія, уласнабеларускія і запазычаныя.

9. Функцыянаванне фразеалагізмаў: актыўнае выкарыстанне, пасіўнае выкарыстанне (спецыяльныя фразеалагізмы, устарэлыя фразеалагізмы ці фразеалагізмы-неалагізмы).

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## Фанетыка. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Лексікаграфія. Фразеалогія. Фразеаграфія

## Бібліяграфічны спіс

### Навуковая і вучэбна-метадычная літаратура


1. Беларуская граматыка: У 2 ч.– Мінск: Навука і тэхніка. – Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск, 1985. – 431 с.
2. Беларуская мова: хрэстаматыя / З.І. Бадзевіч [і інш.]. – Мн.: ПУП Изд-во “Юнипресс”, 2005. – 592 с.
3. Беларуская мова: Цяжкія пытанні фанетыкі, арфаграфіі, граматыкі / Пад рэд. А.І. Падлужнага. – Мн.: Нар. асвета., 1987. – С.6-40.
4. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. – Мн.: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1994. – 654 с.
5. Бірыла М.В. Да пытання аб фарміраванні і важнейшых нормах беларускага літаратурнага вымаўлення // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1958. – № 3.
6. Бурак, Л.І., Бурак І.Л. Сучасная беларуская мова. Арфаграфія і пунктуацыя. Практыкум. – Мн.: Універсітэцкае, 1993. – 247 с.
7. Вардомацкий Л.М. Особенности ударения существительных в русском, белорусском и украинском языках. – Мн.: Выш. шк., 1988. – 128 с.
8. Выгонная Л.Ц. Ад гука да літары. – Мн.: Нар. асвета, 1991. – 78 с.
9. Выгонная Л.Ц. Інтанацыя. Націск. Арфаэпія. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – 215 с..
10. Вячорка В. Правапіс: Спроба сучаснае нармалізацыі // Спадчына. – 1995. -- № 5. – С.247-288.
11. Жураўскі А. Праблемы норм беларускай літаратурнай мовы. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 36 с.
12. Запрудскі С. Парадоксы параўнальнага аналізу.// Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1990. – №1. – С. 14-16.
13. Івашуціч Я.М. Націск у дзеяслоўных формах сучаснай беларускай мовы. – Мн.: Вышэйшая школа, 1981. – 96 с.
14. Калеснік У.А., Янкоўскі Ф.М. Вусная мова і выразнае чытанне. – Мн.: Вучпедвыд БССР, 1962. – 127 с.
15. Каляда А.А. Выразнае чытанне: Вуч. дапам. для філал. фак. пед. ін -таў / Пад. рэд. У.А. Калесніка. – Выд. 2-е перапрац. і дап. – Мн.: Выш. шк. – 1976. – 207 с.
16. Камароўскі Я.М. Сучасная беларуская арфаграфія – Мн.: Нар. асвета, 1985. –160 с.

17. Кароткая граматыка беларускай мовы. У 2 ч. / навук. рэд. А.А. Лукашанец. Ч. 1. Фаналогія. Марфаналогія. Марфалогія. – Мн.: Беларуская навука, 2007. – 351 с.
18. Крывіцкі А.А. Сучасная беларуская літаратурная мова і народныя гаворкі. – Мн., 1961. – 40 с.
19. Крывіцкі А.А., Падлужны А.І. Фанетыка беларускай мовы – Мн.: Вышэйшая школа, 1984. – 268 с.
20. Кузьміч Л.П. Аб узаемадзеянні фальклорнай і нарматыўнай лексікі / Слова беларускае. З гісторыі лексікалогіі і лексікаграфіі / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. – Мн.: Нар. асвета. 1994. – С. 20-24.
21. Куліковіч У.І. Беларускі правапіс: Правілы, заданні, кантрольныя работы. – Мн.: Завігар, 1998. – 280 с.
22. Лексікалогія сучаснай беларускай мовы; пад рэд. А.Я.Баханькова. – Мн.: Навука і тэхніка, 1994. – 463 с.
23. Лепешаў І.Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні: Дапаможнік. – Гродна: ГрДУ, 2002. – 207 с.
24. Лингвистический энциклопедический словарь / Гл. ред. В.Н. Ярцева. – М.: Сов. энциклопедия, 1990. – С.316-317; 390-391; 555-557.
25. Лыч Л. Рэформа беларускага правапісу 1933 года: Ідэалагічны аспект. – Мн.: Навука і тэхніка, 1933. – 39 с.
26. Ляшчынская В.А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: Вучэб. дапам. – Мн.: РІВШ БДУ, 2001. – С. 169-248.
27. Макарова Р.В. Понятие графики и графемы. // В кн.: Система и уровни языка. – М.: Наука, 1969. – С.78-89.
28. Мячкоўская Н. Пра магію літар, ―азбучныя войны і арфаграфічныя забабоны // Культура. – 1999. – 16-22 студз. – С.14.
29. Падлужны А.І. Аб фанематычным прынцыпе ў беларускай арфаграфіі // У кн.: Лінгвістычныя даследаванні. – Мн., 1968. – С.19-24.
30. Падлужны А.І. Нарыс акустычны фанетыкі беларускай мовы. – Мн.: Навука і тэхніка, 1977. –125 с.
31. Падлужны А.І. Праблемы варыянтнасці беларускай літаратурнай мовы // Беларуская мова ў другой палове ХХ стагоддзя. Матэрыялы Міжнар. навук. канфер. – Мн.: БДУ, 1998. – С.28-32.
32. Падлужны А.І. Работа над памылкамі 1933-га // Бел. мова і літ. у школе. – 1991. -- № 3, 4.
33. Падлужны А.І. Фаналагічная сістэма беларускай літаратурнай мовы. – Мн.: Навука і тэхніка, 1969. – 144 с.
34. Падлужны А.І., Чэкман В.М. Гукі беларускай мовы. – Мн.: Выш. шк., 1973. – 264 с.
35. Плотнікаў Б.А. Беларускае слоўніцтва. – Мн., 2003. – 168 с.
36. Плотнікаў Б.А., Антанюк Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум. Мн.: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003. – 672 с.
37. Плотнікаў Б.А., Антанюк Л.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум. Мн.: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003. – 672 с.
38. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. – Мн., 1959. – 160 с.

39. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. – Мн.: Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі, 2008. – 144 с.
40. Працы Акадэмічнае конфэрэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі. – Мн.: Інбелкульт, 1927. – С.48-113.
41. Русак В.П. Марфаналогія сучаснай беларускай мовы. – Мн.: Беларуская навука, 2003. – 316 с.
42. Стеблин-Каменский М.И. Фонема – пучок РП? // Спорное в языкознании.– Л.: Из-во Ленинградского ун-та, 1974. – 111-131.
43. Сучасная беларуская мова: Вучэб. дапам. / М.Ц. Кавалёва, А.К. Юрэвіч, Ф.М. Янкоўскі і інш. – 3-е выд., дапрац. і дап. – Мн.: Выш. шк., 1993. – С.147-149; 156-157; 163-164; 176-184; 185-203.
44. Сучасная беларуская мова. Уводзіны. Фанетыка. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Лексікаграфія. Фразеалогія. Фразеаграфія / Я.М. Камароўскі [і інш.]. – Мінск: Вышэйшая школа, 1995. – 334 с.
45. Сцяцко П. Культура мовы. – Мн.: Тэхналогія, 2002. – С.9-19.
46. Сцяцко П.У. Уводзіны ў мовазнаўства: Дапаможнік – Гродна: ГрДУ, 2001. – С. 105-110.
47. Сямешка Л.І. Беларуская мова. Уводзіны ў навуку аб мове. Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія: Вучэбны дапаможнік. – Мн.: Сучаснае слова, 1999. – 224 с.
48. Сямешка Л.І. Навошта блытаць чалавека з пашпартам? // Настаўніцкая газета. – 1989. – 10, 14, 17 чэрв.
49. Сямешка Л.І., Шкраба І.Р., Бадзевіч З.І. Курс беларускай мовы – Мінск: Універсітэцкае, 1996. – 654 с.
50. Фанетыка беларускай літаратурнай мовы / рэд. А.І. Падлужны. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 335 с.
51. Фанетыка слова ў беларускай мове. – Мн.: Навука і тэхніка, 1983. – 200 с.
52. Шакун Л.М. Гісторыя беларускага мовазнаўства. – Мн.: Універсітэцкае, 1995. – 271 с.
53. Шакун Л.М. Карані роднай мовы: Выбраныя працы па гісторыі беларускай мовы. – Мн.: БДУ, 2001. – 206 с.
54. Шкраба І.Р. Варыянтнасць у сучаснай беларускай мове. – Мн.: ТАА “Асар”, 2004. – 240 с.
55. Шкраба І.Р. Да прычын узнікнення фанетычных варыянтаў у беларускай мове // Веснік БДУ. Сер. 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. Псіхалогія.1975. – № 1. – С.35-40.
56. Шчэрбін В. Факты і міфы. // Бел. мова і літ. ў школе. – 1989. – № 9.
57. Юргелевіч П.Я. Нарыс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі. – Мн.: Вучпедвыд Міністэрства асветы БССР, 1958. – С.96-106.
58. Юргелевіч П.Я. Нарыс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі
59. Янкоўскі Ф.М. Беларускае літаратурнае вымаўленне. -- 4 выд. -- Мн., 1976. – 91 с.

60. Яновіч А.І. Станаўленне графічнай сістэмы беларускай літаратурнай мовы новага перыяду // Бел. лінгвістыка. – 1987. – Вып. 31. – С.16-23.

## Слоўнікі

1. Арашонкава, Г.У. Кіраванне ў беларускай і рускай мовах. Слоўнік-даведнік / Г.У. Арашонкава, В.П. Лемцюгова. – Мінск: Вышэйшая школа, 1991. – 303 с.
2. Бардовіч, А.М. Марфемны слоўнік беларускай мовы / А.М. Бардовіч, Л.М. Шакун. – Мінск: Вышэйшая школа, 1989. – 716 с.
3. Бардовіч, А.М. Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы / А.М. Бардовіч, М.М. Круталевіч, А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларуская навука, 2000. – 413 с.
4. Беларускі арфаграфічны слоўнік / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы; уклад. Л.П. Кунцэвіч, І.У. Кандрацеця; пад рэд. А.А. Лукашанца. – Мінск: Беларуская навука, 2009. – 695 с.
5. Бірыла, М.В. Слоўнік націску ў беларускай мове / М.В. Бірыла. – Мінск: Народная асвета, 1992. – 144 с.
6. Булыка, А.М. Слоўнік іншамоўных слоў: актуальная лексіка / А.М. Булыка. – Мінск: Попурри, 2005. – 336 с.
7. Граматычны слоўнік дзеяслова / НАН Беларусі. Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа; Навук. рэд.: А.І. Падлужны; Уклад. В.П. Русак, Л. Ліхадзіеўская. – Мінск : Беларуская навука, 2007. – 1252 с.
8. Граматычны слоўнік назоўніка / НАН Беларусі. Ін-т мовы і літаратуры імя Якуба Коласа І Янкі Купалы; Навук. рэд. А.Я. Міхневіч, В.П. Русак; Уклад.: Г.У. Арашонкава, Н.А. Чабатар, А.М. Астапчук, В.І. Уласевіч. – Мінск : Беларуская навука, 2008. – 1379 с.
   Завальнюк, У.М. Слоўнік сучаснай беларускай мовы / У.М. Завальнюк, М.Р. Прыгодзіч, В.К. Раманцэвіч / пад агул. рэд. У.М. Завальнюка. – Мінск, Народная асвета, 2009. – 399 с.
9. Клышка, М.К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М.К. Клышка. – Мінск: Вышэйшая школа, 1993. – 445 с.
10. Лазоўскі, У.М. Слоўнік антонімаў беларускай мовы: канкрэтныя выпадкі ўжывання / У.М. Лазоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1994. – 293 с.
11. Лепешаў, І.Я. Слоўнік беларускіх прыказак: Даведнік / І.Я. Лепешаў, М.А. Якалцэвіч. – Мінск: БелЭН, 1996. – 352 с.
12. Лепешаў, І.Я. Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы: у 2 т. / І.Я. Лепешаў. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – Т. 1. – 672 с.; Т. 2 – 704 с.
13. Лепешаў, І.Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І.Я. Лепешаў. – Мінск: БелЭН, 2004. – 448 с.
14. Прыгодзіч, М.Р. Пішам без памылак: асобна, разам, праз дэфіс / М.Р. Прыгодзіч. – Мінск: Парадокс, 2002. – 256 с.

15. Слоўнік асабовых уласных імён / НАН Беларусі. Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа; Навуковы рэдактар А.А. Лукашанец; Уклад. М.Р. Суднік. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск: Беларуская навука, 2005. – 176 с.
16. Слоўнік беларускай мовы. Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне. – Мінск: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1987. – 902 с.
17. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / Аўт.-склад. М.К.Клышка. — Мн.: ПУП "Радыёла-плюс", 2005. – 672 с.
18. Старычонак, В.Дз. Слоўнік амонімаў беларускай мовы / В.Дз. Старычонак. – Мінск: Вышэйшая школа, 1991. – 255 с.
19. Сцяцко, П.У. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П.У. Сцяцко, М.Ф. Гуліцкі, Л.А. Антанюк. – Мінск: Вышэйшая школа, 1990. – 222 с.
20. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1999. – 784 с.
21. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. / пад агульн. рэд. К.К. Атраховіча. – Мінск: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі. Т. 1, 1977. – 608 с.; Т. 2, 1978. – 768 с.; Т. 3, 1979. – 672 с.; Т. 4, 1980. – 767 с.; Т. 5, кн. 1, 1983. – 663 с.; Т. 5, кн. 2, 1984. – 608 с.
22. Шкраба, І.Р. Слоўнік беларускай безэквівалентнай лексікі / І.Р. Шкраба. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – 320 с.